Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка — раўнапраўная рэспубліка ў саставе Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, які ўвасабляе дзяржаўнае адзінства савецкага народа, згуртоўвае ўсе нацыі і народнасці для сумеснага будаўніцтва камунізму.

(З праекта новай Канстытуцыі БССР).


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 12 (1199) 6 красавіка 1978 г. Цана 2 кап.


## ПА БДУ ІНФАРМАЦЫЯ

### У камітэце камсамола

На II пленуме камітэта камсамола БДУ намеснікам сакратара камітэта камсамола БДУ па ідэалагічнай рабоце выбран М. Прыгодзіч, намеснікам сакратара па вучэбнай і навуковай рабоце — М. Няхайчык.

Пленум вызваліў ад абавязкаў намесніка сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце В. Рошчына.

У бюро камітэта камсамола ўведзена студэнтка IV курса журфака Т. Нечыпарук.

### У савеце

«Вынікі навуковага і культурнага супрацоўніцтва універсітэта з замежнымі ВНУ ў 1977 годзе», «Справаздачы аб гаспадарчай дзейнасці універсітэта ў 1977 годзе і аб каштарысе расходаў на 1978 год» — гэтыя пытанні былі разгледжаны на пасяджэнні савета універсітэта. Па першаму пытанню выступіў прарэктар БДУ па рабоце з замежнымі студэнтамі І. П. Чэпа.

### У прафкоме

Адбылося чарговае пасяджэнне прафкома з парадкам дня «Аб выкананні пастановы парткома аб рабоце прафсаюзнай арганізацыі універсітэта». З дакладам выступіў старшыня прафкома М. Дрозд. У дакладзе і выступленнях прафактыву былі вызначаны асноўныя задачы прафсаюзнай арганізацыі універсітэта па выкананню пастановы парткома па дастойнай сустрэчы 60-годдзя БССР і Кампартыі Беларусі і 60-годдзя ВЛКСМ.

* * *

Аргмасавая камісія прафкома БДУ праводзіць зверку вядзення прафсаюзнай дакументацыі ва ўсіх прафсаюзных групах факультэтаў (усяго ва універсітэце больш за 400 прафсаюзных груп). Зверку ўжо прайшлі прафсаюзныя групы філалагічнага факультэта, ФПМ, хімічнага, механіка-матэматычнага, гістарычнага факультэтаў.

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЕКТ НОВАЙ КАНСТЫТУЦЫІ БССР



Прыўзняты і радасны настрой пануе зараз у студэнтаў, аспірантаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. З вялікай цікавасцю чытаюць яны праект новай Канстытуцыі БССР. На факультэтах і ў групах праходзяць сходы, прысвечаныя абмеркаванню праекта.

На высокім узроўні прайшоў адкрыты партыйны сход на факультэце журналістыкі. З дакладам аб праекце новай Канстытуцыі БССР выступіла С. П. Карэйша. Камуністы Б. В. Стральцоў, В. М. Куцэнка, У. Бельскі і іншыя ў сваіх выступленнях адзначылі, што праект новай Канстытуцыі БССР пакідае вялікае ўражанне. Пасля яго апублікавання ў калектыве наглядаецца вялікі працоўны і палітычны ўздым.

Праект новай Канстытуцыі БССР, вынесены на ўсенароднае абмеркаванне, пераканаўча дэманструе сапраўды народны характар Савецкай улады.

30 сакавіка адбыўся II пленум камітэта камсамола універсітэта. З дакладам «Аб павышэнні ролі камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп у падрыхтоўцы і выхаванні спецыялістаў» выступіў сакратар камітэта камсамола універсітэта А. А. Тозік.

У спрэчках па дакладу выступілі: В. Гарус (сакратар камітэта камсамола ФПМ), І. Шалатонін (камсорг IV курса радыёфізічнага факультэта), А. Жук (намеснік сакратара камітэта камсамола механіка-матэматычнага факультэта) і многія іншыя.

Пленум прыняў пастанову па разгледжанаму пытанню.




Вялікім аўтарытэтам карыстаецца ў сяброў і выкладчыкаў студэнтка IV курса геафака Таццяна Свіціна. Яна — член бюро камітэта камсамола універсітэта, адказная за работу сектара інфармацыі і кантролю.

Таня будзе прадстаўляць камсамол БДУ на XVIII з'ездзе ВЛКСМ у Маскве.

Фота У. Патапенкі, А. Якубоўскай.

## ВІНШУЕМ

факультэт журналістыкі, які заняў першае месца ў фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці БДУ імя У. І. Леніна.

Новых вам поспехаў, дарагія сябры!

## НАСУСТРАЧ XVIII З'ЕЗДУ ВЛКСМ

# Камсамольскія арганізацыі: праблемы і задачы

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад «Аб павышэнні ролі камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп у падрыхтоўцы і выхаванні спецыялістаў», пленум камітэта камсамола адзначае, што, выконваючы рашэнні XXV з'езда КПСС, XXVIII з'езда КПБ і XVII з'езда ВЛКСМ, камсамольская арганізацыя універсітэта дабілася сур'ёзных поспехаў у сваёй рабоце. Яна вырасла колькасна і ўмацавалася арганізацыйна. Сярод студэнтаў 1456 выдатнікаў, 18 імянных стыпендыятаў, 4350 чалавек займаюцца на добра і выдатна. З году ў год расце і колькасць студэнтаў, якія займаюцца навукова-даследчай работай, павялічваецца колькасць прыкладных студэнцкіх даследаванняў. Значная колькасць членаў ВЛКСМ удзельнічае ў грамадскім жыцці сваіх калектываў. Пазысіўся ўзровень арганізацыі і правядзення грамадска-палітычнай практыкі, паявіліся новыя формы маральнага і эстэтычнага выхавання студэнтаў. Высокіх вынікаў дабіўся ў мінулым годзе зводны СБА універсітэта, які заваяваў пераходны Чырвоны сцяг мінскіх абкома партыі і аблвыканкома.

Паспяхова працуюць, дабіваючыся з году ў год высокіх вынікаў, камсамольскія арганізацыі філалагічнага і гістарычнага факультэтаў (сакратары Ж. Рымкевіч і В. Міхальчук). У бягучым навучальным годзе прыкметна актывізавалі сваю дзейнасць камсамольскія арганізацыі механіка-матэматычнага, біялагічнага, хімічнага і геаграфічнага факультэтаў (сакратары А. Казулін, Л. Перадрый, А. Рухля, Л. Гайдукевіч).

Значных вынікаў у сваёй рабоце дасягнулі камсамольскія арганізацыі шэрагу акадэмічных груп: трэцяй групы пятага курса біяфака, пятай групы трэцяга курса юрфака, групы эканомгеографаў пятага курса геафака, другога курса аддзялення палітэканоміі гістфака, другой групы другога курса рускага аддзялення філфака (камсоргі М. Матыль, Н. Майсеенка, В. Калеснікаў, В. Бакарасаў, Н. Сінічэнка, А. Вішнеўская) і некаторыя іншыя. Камсамольцы, якія займаюцца ў гэтых групах, з сесіі ў сесію здаюць экзамены на добра і выдатна, прымаюць актыўны ўдзел у грамадска-палітычнай рабоце, жывуць цікавым, насычаным жыццём.

Разам з тым пленум адзначае, што ў дзейнасці камсамольскіх арганізацый многіх акадэмічных груп універсітэта маюцца сур'ёзныя недахопы: адсутнічае агульны ўстойлівы інтарэс да вучобы, да сваёй будучай спецыяльнасці, фармальна, на нізкім арганізацыйным узроўні праводзіцца сацыялістычнае спаборніцтва, Ленінскі залік, грамадска-палітычная практыка і атэстацыя па іх выніках; камсамольскія сходы дакладна не рыхтуюцца і праходзяць нецікава, не здзяйсняецца ўлік і кантроль за якасцю выканання грамадскіх даручэнняў; нездазальняюча вядзецца камсамольская дакументацыя; актыў працуе вяла і безініцыятыўна (асабліва на нізкім узроўні ўнутрысаюзная работа знаходзіцца ў камсамольскіх арганізацыях фізфака). Вынікам усяго з'явілася тое, што па рэзультатах апошняй сесіі 558 студэнтаў універсітэта атрымалі нездавальняючыя адзнакі, непаспяваючыя студэнты ёсць у 255 з 434 акадэмічных груп, 3 тысячы студэнтаў займаюцца з тройкамі або толькі на «здавальняюча», 30 працэнтаў студэнтаў недастаткова актыўна ўдзельнічаюць у грамадскім жыцці сваіх калектываў, 20 выпускнікоў у 1978 годзе «не даехалі» да месца сваёй работы.

Такое становішча спраў у акадэмічных групах з'яўляецца сур'ёзным тормазам у развіцці камсамольскай арганізацыі універсітэта.

**II пленум камітэта камсамола пастанаўляе:**

1. Павышэнне ролі камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп у падрыхтоўцы і выхаванні спецыялістаў лічыць асноўным напрамкам у дзейнасці камітэтаў камсамола універсітэта і факультэтаў, камсамольскіх бюро курсаў, патокаў, кафедр і груп, усёй камсамольскай арганізацыі ВНУ.

2. Камітэтам камсамола факультэтаў, камсамольскім бюро курсаў, патокаў, кафедр і груп, абапіраючыся на дапамогу партыйных арганізацый, прафе-


(Заканчэнне на 2-й стар.).

# Камсамольскія арганізацыі: праблемы і задачы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

сарска-выкладчыцкага саставу, распрацаваць мерапрыемствы і разгарнуць мэтанакіраваную работу па фарміраванню ў акадэмічных групах агульнага ўстойлівага інтарэсу да вучобы, да будучай спецыяльнасці, выхаванню ў студэнтаў разумення маральна-палітычнага сэнсу працы па выбранай спецыяльнасці.

3. Кіруючыся ўказаннямі XXVI з'езда ЛКСМБ аб неабходнасці «настойліва павышаць адказнасць кожнага маладога чалавека за вынікі сваёй вучобы», лічыць неабходным:

— кожны факт атрымання членам ВЛКСМ нездавальняючай адзнакі самым уважлівым чынам абмяркоўваць у камсамольскай арганізацыі групы;

— прасіць рэктарат строга кантраляваць тэрміны перадачы акадэмічнай запазычанасці, устаноўлены Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР (на працягу аднаго месяца пасля заканчэння сесіі);

— у выпадку паўторнага атрымання камсамольцам нездавальняючай адзнакі ў чарговую сесію разглядаць яго асабістую справу.

4. Камітэтам камсамола факультэтаў, камсамольскім бюро груп шырэй прапагандаваць вопыт выдатнікаў вучобы, ленінскіх і імянных стыпендыятаў. Пазысіць іх адказнасць за стан спраў у акадэмічных групах.

5. Пленум падкрэслівае неабходнасць працягваць работу па ўдасканаленню арганізацыі Ленінскага заліку і грамадска-палітычнай практыкі. Камітэтам камсамола, камсамольскім бюро яшчэ раз прааналізаваць якасць асобных комплексных планаў удзельнікаў заліку, пастаянна кантраляваць іх выкананне, актывізаваць работу атэстацыйна-метадычных камісій, больш прынцыпова падыходзіць да атэстацыі ўдзельнікаў заліку.

6. Камітэтам камсамола, камсамольскім бюро дабівацца прыцягнення ўсіх без выключэння камсамольцаў у актыўную грамадска-палітычную дзейнасць. Звярнуць асаблівую ўвагу на ўдзел кожнага студэнта ў студэнцкіх будаўнічых або сельскагаспадарчых атрадах. Увесці ў практыку работы сістэму калектыўных даручэнняў, вызначэнне базавых напрамкаў у дзейнасці кожнай камсамольскай арганізацыі.

7. Звярнуць асаблівую ўвагу на актыўнае ўключэнне ў грамадскае жыццё камсамольскіх арганізацый студэнтаў-першакурснікаў. З гэтай мэтай у камсамольскіх арганізацыях першых курсаў у лістападзе-снежні праводзіць папярэднюю атэстацыю ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!». Замацаваць за кожнай акадэмічнай групай першага курса ў якасці куратара вопытных камсамольскіх актывістаў старэйшых курсаў.

8. Карэнным чынам змяніць практыку падрыхтоўкі і правядзення камсамольскіх сходаў. На парадак дня сходаў выносіць найбольш актуальныя пытанні жыцця краіны і Ленінскага камсамола, сваёй камсамольскай арганізацыі. Для падрыхтоўкі сходу прыцягваць максімальную колькасць членаў арганізацыі. Дакладна рыхтаваць праекты пастаноў, узмацніць кантроль за іх выкананнем.

9. Камітэтам камсамола факультэтаў да 15 красавіка г. г. распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па паляпшэнню правядзення спаборніцтва за праза падпісаць Рапарт ЦК КПСС да 60-годдзя ВЛКСМ і спаборніцтва камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!». Лічыць мэтазгодным, пачынаючы з 1977-78 навучальнага года, вынікі спаборніцтва падводзіць асобна па I курсах і асобна па II—V. Шырэй практыкаваць заключэнне дагавораў аб сацспаборніцтве паміж камсамольскімі арганізацыямі акадэмічных груп розных курсаў і факультэтаў, паміж акадэмічнай групай, з аднаго боку, і камсамольска-маладзёжным калектывам, класам у школе, вучэбнай групай у прафтэхвучылішчы — з другога.

10. З мэтай павышэння адказнасці актыву за вынікі навучальнага года, удзел арганізацыі ў СБА і восеньскіх сельгасработах справаздачы і выбары ў цэхавых камсамольскіх арганізацыях у 1978 годзе правесці ў кастрычніку месяцы. Камітэтам камсамола, камсамольскім бюро звярнуць сур'ёзную ўвагу на работу з рэзервам камсамольскага актыву, рэкамендаваць на выбарную камсамольскую работу лепшых студэнтаў, здольных павесці за сабой арганізацыю, шырэй прыцягваць да камсамольскай работы студэнтаў-камуністаў.

11. Камсамольскім бюро акадэмічных груп да 1 мая г. г. прывесці дакументацыю ў адпаведнасць з патрабаваннямі інструкцыі ЦК ВЛКСМ «Аб вядзенні справаводства ў пярвічных камсамольскіх арганізацыях».

12. З мэтай паляпшэння стану ўнутрысаюзнай работы аддзелу камітэта камсамола БДУ да 1 кастрычніка г. г. падрыхтаваць і надрукаваць у друкарні «Дзённік сакратара камсамольскай арганізацыі акадэмічнай групы».

13. Камітэтам камсамола факультэтаў актывізаваць работу факультэцкіх школ камсамольскага актыву. Бюро камітэта камсамола БДУ да 1 кастрычніка распрацаваць і зацвердзіць «Прыкладную праграму школы камсамольскага актыву факультэта».

14. Даручыць сацыялагічнай лабараторыі пры камітэце камсамола вывучыць пытанне і падрыхтаваць рэкамендацыі аб найбольш эфектыўных формах і метадах работы камсамольскіх арганізацый па фарміраванню ў акадэмічных групах высокамаральнага клімату, агульнага ўстойлівага інтарэсу да вучобы і будучай спецыяльнасці.

Пленум камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна выражае ўпэўненасць, што камсамольскія арганізацыі універсітэта, накіроўваючы свае намаганні на дастойную сустрэчу XVIII з'езда ВЛКСМ, 60-годдзя Ленінскага камсамола, 60-годдзя БССР і КПБ, унясуць максімальны ўклад у выкананне задач, якія пастаўлены XXV з'ездам КПСС перад камсамолам, савецкай вышэйшай школай.

---

## Да XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване

# Песню дружбы запявае моладзь

(Працяг).

III Сусветны фестываль сабраўся ў складаны час. В'етнамцы змагаліся з французскімі каланізатарамі. Супраць амерыканскіх захопнікаў вялі вызваленчую вайну патрыёты Карэі. Міралюбівыя народы усіх краін у сувязі з пагрозай развязвання новай сусветнай вайны праводзілі збор подпісаў пад Зваротам Сусветнага Савета Міру аб заключэнні акта міру паміж пяццю вялікімі дзяржавамі.

Па свайму размаху фестываль, які адбыўся у 1949 годзе ў Берліне, перасягнуў папярэднія. На яго прыбылі 26 тысяч юнакоў і дзяучат — прадстаўнікоў моладзі 104 краін зямнога шара.

Упершыню ў фестывалі прымала ўдзел моладзь КНР, Японіі, Чылі, Таіланда і іншых краін.

Буйным палітычным мерапрыемствам фестывалю з'явілася магутная дэманстрацыя супраць пагрозы новай вайны, супраць заходнегерманскага рэваншызму, мілітарызму і неафашызму, у якой прынялі ўдзел 2 мільёны нямецкіх юнакоў і дзяўчат. У радах дэманстрантаў ішлі 45 тысяч маладых людзей з Заходняй Германіі, якія прыбылі на фестываль, нягледзячы на тое, што ўзброеныя атрады заходнегерманскай паліцыі закрылі мяжу.

На фестывалі ад імя мільёнаў юнакоў і дзяучат былі абвешчаны словы клятвы:

«Мы, удзельнікі Сусветнага фестывалю, усведамляючы небяспеку, што пагражае чалавецтву, і сваю адказнасць у агульнай барацьбе народаў за мір, ад імя дзесяткаў мільёнаў міралюбівай моладзі ўсіх краін даём урачыстую клятву: аддаць усе сілы барацьбе за тое, каб не дапусціць развязвання новай вайны, зрываць і выяўляць планы ворагаў свету і чалавецтва, змагацца супраць гонкі ўзбраенняў і выступаць за паляпшэнне жыццёвых умоў моладзі, умацоўваць дружбу і мірнае супрацоўніцтва народаў і моладзі ўсіх краін, захоўваць, умацоўваць і расшыраць адзінства, якое знайшло цудоўнае адлюстраванне у Сусветным фестывалі, прыцягнуць да гэтай актыўнай барацьбы новыя мільёны юнакоў і дзяўчат».

30 тысяч дэлегатаў са 111 краін свету сабраліся летам 1953 года на IV Сусветны фестываль у Бухарэсце.

У 1953 годзе за некалькі дзён да адкрыцця фестывалю спынілася вайна ў Карэі—гэта была перамога сусветнага значэння. Гэта падзея ўдзельнікамі фестывалю была адзначана грандыёзным святам, бо ў гэтай перамозе ўсяго міралюбівага чалавецтва была заслуга і моладзі. «Дух перагавораў павінен перамагчы дух сілы!» — гэты лозунг, таксама як і лозунг «Праз знаёмства — да дружбы», заваяваў прызнанне ва ўсіх удзельнікаў Бухарэсцкага фестывалю.

**А. ДАНЕКІН,**
загадчык інтэраддзела камітэта камсамола БДУ.

(Працяг будзе).

---

# ПІТОН І ЯШЧЭ... 999 ЖЫВЁЛ

Заалагічны музей універсітэта. Сюды на экскурсію прыйшлі вучні 50-й сярэдняй школы нашага горада.

...У цішыні чуцен голас настаўніка:

— Музей пачаў арганізоўвацца з 1921 года прафесарам Фядзюшыным. Спачатку гэта быў заалагічны кабінет, які пазней перарос у музей,—расказвае Валерый Аляксандравіч Грынеўскі.— Зараз ён налічвае больш тысячы экспанатаў. Ёсць багаты фонд-запаснік. А зараз, дзеці, звярніце ўвагу вось на гэты экспанат.

Настаўнік указаў на тыгравага пітона. Вучні са здзіўленнем абступілі васьмімятровага паўзуна.

— А дзе жыве пітон?—запыталася дзяўчынка з дробным тварыкам.

— У Індыі.

Ідуць па зале з двума хлопчыкамі.

— Глядзіце, а вось такія рыбы ёсць і ў нашай рэчцы,—выпаліў Міша.

Рабят цікавіць усё—прадстаўнікі атрада каракадзілаў, насякомыя, птушкі...

Пры ўваходзе ў другі пакой музея бачна магутная постаць белавежскага зубра. Побач—чучалы лася і чорнага мядзведзя, падораныя калектывамі Мінскага медінстытута і Віцебскага ветэрынарнага інстытута ў дзень 50-годдзя БДУ.

Шасцікласнікі з цікавасцю слухаюць Валерыя Аляксандравіча, задаюць пытанні. Цяпер яны будуць яшчэ больш актыўна выступаць на ўроках заалогіі.

Закончылася кароткае падарожжа ў краіну ведаў. Вучні, здзіўленыя ўбачаным, усё яшчэ працягвалі дзяліцца ўражаннямі.

**А. ЖУРАЎЛЁЎ,**
студэнт журфака.



Студэнтка III курса хімфака Люда Корзун на практычных занятках. Фота С. Лыскаўца.

---

## Слова савету выдатнікаў

# Дайсці да кожнага

Выдатнікам мы называем студэнта, які не толькі першы ў вучобе, але і актыўны ўдзельнік усіх грамадскіх спраў. У нас на факультэце было шмату студэнтаў, якія вучыліся на выдатна, але не ўсе з іх займаліся грамадскай работай. Савет выдатнікаў пры камітэце камсамола мехмата з пачатку навучальнага года паставіў задачу: кожны выдатнік вучобы павінен мець камсамольскае даручэнне, займацца грамадскай работай. І мы гэтага дабіліся. Але толькі гэтым нельга абмяжоўвацца. Студэнт-выдатнік, акрамя ўсяго, павінен дапамагаць сваім таварышам у вучобе.

Вялікую дапамогу перад зімовай сесіяй выдатнікі факультэта аказалі студэнтам І курса. Яны правялі гутаркі з першакурснікамі, падзяліліся вопытам арганізацыі сваёй самастойнай работы, вучобы. Былі праведзены сходы аб падрыхтоўцы да зімовай сесіі, на якіх выступалі выкладчыкі і выдатнікі факультэта. Ва ўсіх групах І курса былі арганізаваны пасты ўзаемадапамогі, кансультацыі, якія праводзілі лепшыя студэнты. Савет выдатнікаў арганізаваў на І курсе лекторый «Вучыся вучыцца». Было прачытана 4 лекцыі: аб нашым факультэце, аб гісторыі універсітэта, аб тым, як арганізаваць рабочы дзень студэнта, як правільна канспектаваць. Лекцыі прайшлі вельмі цікава, першакурснікі задавалі шмат пытанняў. Мы лічым, што гэта карысная пачынанне. Толькі такія лекцыі трэба старацца праводзіць у самым пачатку навучальнага года, каб дапамагчы першакурснікам адразу ж знайсці неабходны рытм вучобы.

На ІІ курсе ў акадэмічных групах члены савета выдатнікаў праводзілі кансультацыі па найбольш цяжкіх тэмах па асобных прадметах, г. зн. лепшы студэнт прапрацоўвае пэўную тэму прадмета і адказвае на пытанні студэнтаў групы.

Акрамя таго, выдатнікі факультэта дзяліліся вопытам сваёй вучобы, работы са студэнтамі факультэта праз насценгазету І курса. Савет выдатнікаў факультэта выпускае газету-інтэрв'ю «Знаёмцеся, нашы выдатнікі». Праз гэту газету выдатнікі факультэта адказваюць на шматлікія пытанні, якія цікавяць студэнтаў, расказваюць аб сваёй вучобе, грамадскай і навуковай рабоце.

У якасці заахвочвання многія выдатнікі факультэта запісаны ў бібліятэку Акадэміі навук БССР, атрымліваюць там навейшую літаратуру па тэматыцы іх навуковых, курсавых і дыпломных работ.

Мы лічым, што работа нашага савета выдатнікаў дапамагае ў павышэнні паспяховасці на факультэце, прыцягвае выдатнікаў да грамадскай работы, тым самым дапамагае стаць ім у будучым сапраўды высокакваліфікаванымі спецыялістамі.

Па выніках апошняй зімовай сесіі наш факультэт заняў 5-е месца па паспяховасці ва універсітэце. Мы лічым, што гэта добра ў параўнанні з мінулай зімовай сесіяй, калі наш факультэт быў у ліку апошніх. Сярэдні бал па факультэту — 4,07. 160 студэнтаў здалі зімовую сесію на выдатна. Колькасць непаспяваючых у гэту сесію значна паменшылася. Вынікі сесіі ў цэлым палепшыліся. Але ёсць яшчэ непаспяваючыя студэнты і студэнты, якія займаюцца на здавальняюча, таму яшчэ шмат прадстаіць папрацаваць і акадэмічнай камісіі камітэта камсамола, і савету выдатнікаў факультэта.

**Т. ШУМАК,**
старшыня савета выдатнікаў механіка-матэматычнага факультэта.

(Працяг. Пачатак у №№ 9, 10).

Кожная наступная сустрэча прыносіла нешта новае, раней невядомае. З кожным днём яны ўсё больш пазнавалі сваіх таварышаў, сябе, здзіўляліся здольнасцям членаў іх маленькага калектыву. Не маглі як след пазнаць Марчука. Ён пакінуў іх — перайшоў на завочнае. Фізічная сіла пляскала цераз край, а вось маральнай... Яе проста не было. Хто б мог падумаць, што сарамлівы Грыша Тыбербай стане душой групы, гумарыстам?! Да таго ж, як выявілася, ён піша вершы. Валодзя Славінскі ўвесь аддаўся спорту. Шкарупа пачаў займацца пантамімай у адным з народных тэатраў Мінска, паралельна праявіў бліскучыя здольнасці да спорту, трэніраваўся з Грыгор'евым. «Наш Брумель» — пачалі зваць яго ў групе. Наш... Дастаткова аднаго гэтага, каб мець уяўленне аб чалавеку, аб тым, якое месца ён займае ў калектыве. Калі гаварыць аб месцы, то Саша — на адным з першых. Яго арганізатарскім здольнасцям можна толькі зайздросціць.

# У. БЕЛЬСКІ

# ГЕОГРАФЫ

НАРЫС

«Адзін чалавек не можа быць чалавекам сам па сабе. Каб ім стаць, патрэбен нехта другі, каб яго аклікнулі». Гэта сказаў Б. Брэхт. У кожным закладзены нейкія здольнасці і таленты, аб якіх нават сам уладальнік не ведае. Выяўляецца гэта часта раптоўна. Раптоўна для самога сябе і для астатніх.

**Валера Бакарасаў — спакойны, разважлівы — амаль нічым не выдзяляўся сярод астатніх. Вучыўся, і толькі. Спачатку, калі выбіралі актыў групы, яго абышлі. Частковыя даручэнні не зусім задавальнялі. Ён жадаў нечага большага, складанага, адказнага. Сказаць не мог — палічылі б за выскачку. Ужо крыху пазней — пры выбарах групкамсорга — нехта прапанаваў яго. Можа і проста так, каб пасмяяцца... Але прынялі ўсур'ёз, выбралі. Праз некаторы час Валера даказаў, што група не памылілася ў выбары.**

Як мала патрэбна чалавеку! Апоры, каб упэўнена стаць і заявіць аб сабе, а дакладней, знайсці сябе. Галоўнае, каб яго прыкмецілі, заўважылі астатнія, падтрымалі. Можа, гэта патрэбна было і Тані Раманюк, Тані Казаковай, Іры Бачыле, Олі Валодзькінай і Лене Гусевай. Яны сталі нібы іншымі. Яны сталі самімі сабой. Пераканаць сябе цяжка — гэта зразумела Таня Казакова. Лена Гусева выйшла замуж, але не толькі не адышла ад аднакурснікаў у бок, а наадварот, падключыла да групы свайго мужа. Таня Раманюк, Іра Бачыла амаль увесь час прападаюць у інтэрнаце — цягне да сваіх, без іх сумна нават дома.

Змяніў свой пункт гледжання і Шупляկоў. Яго дапытлівасць і цікаўнасць трапілі ў правільнае русла — на трэцім курсе ён пачаў узначальваць студэнцкае навукозае таварыства факультэта.

**Недасеенка да крайнасці любіў падарожжы. Запаветнай марай яго было возера Байкал. У час практыкі ён усё-такі ўбачыў яго! Практыка была на Урале, пасля яе Саша адзін паехаў на Байкал. Адтуль прыслаў куратару пісьмо, кароценькае, усяго два словы: «Я — на Байкале». Гэта значыла: я першы з'ездзіў на возера, першы...**

Неяк Саша расказаў куратару аб сваіх планах па тэме курсавой работы, якую ён збіраўся пісаць. Яна абяцала яму дапамагчы, стаць кіраўніком. Але яго «аддалі» іншаму выкладчыку. Аддалі без ведама куратара: яна была за мяжой і, прыехаўшы, нічога не змагла зрабіць.

Саша пакрыўдзіўся, сур'ёзна і надоўга. Крыўда перарасла ў «вайну», прычыны якой, акрамя іх, ніхто не ведаў. Недасеенка на лекцыях гучна размаўляў, наўмысна спазняўся. Часам хацеў пагаварыць з куратарам, але не рашаўся падысці. Гэтага хацела і Людміла Андрэеўна, спрабавала разабрацца ў незвычайнай сітуацыі. Яна разумела яго, даравала ў душы...

На экзамене ён атрымаў па яе прадмету выдатна. Не паверыў, думаў, што за «грахі» яна паставіць яму тройку. У той жа дзень ён падышоў да яе сам. Размова была доўгай...

## БЕЗ ТРОЕК

**Да гэтага ніхто не ішоў дзеля першага месца. Яны не патрабавалі п'едэстала. Склалася ўсё неяк само сабой.**

**А пачалося, бадай, са Струка, старасты групы. Яго стараннасці мог пазайздросціць кожны. Стараннасці і моцнай сіле волі. Зайздросцілі і пыталіся ў сябе: «А я? Чым я горшы?» Першая, другая... чацвёртая сесіі. Троек сталі саромецца. Было сорамна перад групай.**

Фалько і Турава неяк размаўлялі з куратарам. Размова ішла не аб іх тройках, гаварылі аб усім. Людміла Андрэеўна расказала, як аднойчы яна ішла па дарозе больш 15 кіламетраў. Не, машыны былі. Толькі яна захацела праверыць сябе, ці зможа да канца ўтрымацца. Машыны спакусліва снавалі адна за адной, колькі разоў шафёры прапаноўвалі падвезці. «Толькі я загадала сабе ісці і патрабавала ад сябе, каб гэты загад выканала», — сказала тады Людміла Андрэеўна. Няма такога жадання, якое б не магло стаць явай. Проста перад табой увесь час павінна быць нейкая мэта, як маяк. Толькі жыць ёю кожны дзень, кожную гадзіну. Яны таксама загадалі сабе: здаць сесію на добра і выдатна.

Здалі. Зусім кароткае слова.

Ніхто не здзіўіўся, калі пятая і шостая сесіі былі без троек. Гэтага жадалі, да гэтага імкнуліся. Здзівіліся толькі таму, што група заняла першае месца на факультэце і трэцяе ва універсітэце. Лічылі, што атрымалася першынство выпадкова. Проста было сорамна за тройку перад самім сабой і таварышамі. Але не боязна, не. Гэта два розныя бакі аўтарытэту групы: паважаць і баяцца. Паважаць таварыша, групу усюды: на занятках і па-за факультэтам. І баяцца толькі ў перыяд сесіі.

**Пра іх загаварылі. Загаварылі яшчэ больш, калі яны занялі першае месца сярод акадэмічных груп універсітэта. Гаварылі рознае і па-рознаму. Успомнілі пра экзамен, які здавалі свайму куратару. Тады было каля дзесятка пяцёрак. Усе ведалі складанасць прадмета, скупасць выкладчыка на выдатныя адзнакі. Гэта быў для іх экзамен, бадай, самы цяжкі. Экзамен на веды і на сталасць. Абсалютны выдатнік Грыша Тыбербай атрымаў тады чацвёрку. Выкладчык Варонежскага універсітэта, які прысутнічаў на экзамене, здзівіўся, што экзамен ішоў амаль 12 гадзін. Здзівіўся і высокаму ўзроўню ведаў групы.**

І вось — першае месца.

Яны хваляваліся, што некаторыя на факультэце аднабакова разумелі іх і тлумачылі поспех таксама аднабакова.

— Ды кіньце вы, ну няхай гавораць, — не вытрымаў аднойчы на сходзе Шкарупа. — Аляксей Марэсьеў казаў, што ў жыцці ў кожнага павінен быць свой камісар. Можа, і мы з'яўляемся тым камісарам для астатніх груп? Зайздросцяць заўсёды лепшаму, добраму, якое адрозніваецца нечым ад астатняга. Кожны ў жыцці камусьці зайздросціў, а потым браў прыклад. А калі б не было тых камісараў?

(Заканчэнне будзе).



У спецыяльнай лабараторыі ядзернай электронікі пры кафедры ядзернай фізікі БДУ студэны фізфака праводзяць лабараторныя работы па курсах аналагавай і лічбавай ядзернай электронікі. Пры дапамозе функцыянальна-закончаных радыёэлектронных схем на наборным полі можна за кароткі тэрмін сабраць макет любой радыёэлектроннай схемы.

**НА ЗДЫМКАХ:** студэнтка IV курса фізфака **Н. ШЧОГАЛЕВА** расказвае аб будове модуляў: дацэнт кафедры ядзернай фізікі **В. Я. ЯМНЫ** у час лабараторнай работы са студэнтамі; тэхнік лабараторыі ядзернай фізікі **В. БАМБАЛІНА.**

Тэкст і фота **В. ДРАЧОВА.**





## Пазыўныя трэцяга працоўнага

### Спаборнічаюць будатрады

Хутка надыдзе пара студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Падрыхтоўка да трэцяга працоўнага семестра вядзецца ўжо зараз. На факультэце радыёфізікі і электронікі сфарміравана сем атрадаў. Летам яны будуць працаваць на будоўлях Мінска, Мінскай і Пскоўскай абласцей, Карэліі.

Будаўнічыя аб'екты чакаюць сваіх гаспадароў. Якасць і эфектыўнасць работы студэнтаў у многім будуць залежаць ад таго, як пройдзе падрыхтоўчы перыяд. Штаб працоўных спраў камітэта камсамола факультэта арганізаваў сацыялістычнае спаборніцтва паміж атрадамі. Яно дапамагае наладзіць рытм атраднага жыцця, бо ахоплівае ўсе бакі дзейнасці ў падрыхтоўчы перыяд. У ходзе яго выхоўваюцца пачуццё калектывізму, дружбы, прынцыповыя адносіны да сябе і сваіх сяброў. А без гэтага немагчыма абысціся ў сумеснай працы.

Жыццё атрадаў у падрыхтоўчы перыяд напоўнена цікавымі падзеямі і справамі. Камсамольцы сустракаюцца з ветэранамі вайны і працы, вядуць актыўную прапагандысцкую работу, агітбрыгады прымаюць удзел у шэфскіх канцэртах. А зусім нядаўна паміж атрадамі былі праведзены спаборніцтвы па баскетболу. Кожны атрад выпускае насценгазету, у якой расказвае аб сваіх справах, поспехах, дасягненнях.

Думаецца, што да фінішу падрыхтоўчага перыяду ўсе атрады прыйдуць з добрымі вынікамі. Галоўнае не тое, хто стане пераможцай: «Фатон», «Амега» ці атрад імя І. В. Курчатава. Важна, што спаборніцтва дапаможа ўсім атрадам з'яднаць свае рады, зрабіць іх баяздольнымі. У гэтым яго асноўная мэта.

**В. ШАЛІЎСКАЯ.**
**(Прэс-цэнтр прафкома БДУ).**

### «Атланты»

Неўзабаве лета, а разам з ім і трэці працоўны семестр. На ўсіх факультэтах універсітэта праходзіць падрыхтоўчы перыяд студэнцкіх будаўнічых атрадаў. На механіка-матэматычным факультэце сфарміравана 7 атрадаў па наступных напрамках: Карэлія, Пскоўская вобласць, г. Мінск, Мінская вобласць, 3 атрады паедуць у Малдавію.

У многіх атрадах касцяк складаюць студэнты, якія некалькі разоў працавалі ў саставе СБА. Для камандзіра атрада «Атланты» Мікалая Антановіча, камісара Аркадзя Суржанскага, байцоў С. Кавалевіча, М. Каляды, Т. Любушкінай, У. Харытонава гэта лета будзе ўжо трэцім працоўным. Не выпадкова, што і план мерапрыемстваў на падрыхтоўчы перыяд складзен так, каб з'яднаць атрад, стварыць сярод байцоў дзелавую і разам з тым сяброўскую атмасферу. Кожны баец мае пастаяннае даручэнне. Атрад паспяхова здаў экзамен па тэхніцы бяспекі, агітбрыгада выступіла на універсітэцкім фестывалі мастацкай самадзейнасці з новай праграмай, прысвечанай 60-годдзю Ленінскага камсамола, выпушчана некалькі насценгазет. Але наперадзе яшчэ шмат цікавых мерапрыемстваў: паездка ў Радашковічы на месца гібелі ганаровага байца атрада М. Гастэлы, выступленне з канцэртамі перад воінамі, лекцыі ў сярэдняй школе.

«Атланты» выклікалі на сацспаборніцтва атрад «Спадчына». На чарговым камсамольскім сходзе СБА «Атланты» байцы паставілі перад сабой мэту — выйсці пераможцамі сярод атрадаў факультэта ў падрыхтоўчым перыядзе.

**В. МАЛЧАН,**
**студэнт III курса**
**механіка-матэматычнага**
**факультэта,**
**баец СБА «Атланты».**

### Права паехаць на БАМ

З нецярплівасцю чакаюць пачатку працоўнага семестра байцы атрада «Кастрычнік» гістарычнага факультэта.

Вярнуўшыся ў мінулым годзе з Пскоўскай вобласці, атрад захаваў ядро і зараз інтэнсіўна рыхтуецца да новых выпрабаванняў. Вядзецца вялікая грамадска-палітычная работа. Сектар шэфскай дапамогі ўстанавіў кантакты з СШ № 77 г. Мінска. Валя Багіна, адказная за работу сектара, разам з іншымі членамі СБА рыхтуе вечар, на якім выступіць атрадная агітбрыгада. Чытаецца цыкл лекцый для школьнікаў, афармляюцца стэнды, прысвечаныя Ленінскаму камсамолу. Дапамагаюць студэнты школьнікам і ў фарміраванні працоўных атрадаў старшакласнікаў, якія сёлета будуць працаваць на розных аб'ектах.

Атрадная лектарская група ўжо амаль выканала план падрыхтоўчага перыяду. Прачытана 34 лекцыі з 40. Але, як лічыць А. Ярашэнка, адказны за падрыхтоўку лектараў у атрадзе, група павінна значна павялічыць колькасць і павысіць якасць лекцый. Тэматыка іх разнастайная: «Канстытуцыя СССР», «Наш Ленінскі камсамол», «БДУ — флагман вышэйшай школы рэспублікі» і інш.

Атрад у гэтым годзе будзе працаваць на будаўніцтве БАМа. Жадаючых трапіць у атрад вельмі многа. Асноўным паказчыкам для кандыдатаў у састаў атрада, пропускам у атрад з'яўляецца грамадска-палітычная работа.

**В. ЛЮКЕВІЧ,**
**студэнт гістарычнага**
**факультэта.**

